Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№141 (28505)

26 ЛІПЕНЯ 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 5–12



## Вёска, дзе гадуюць чэмпіёнаў

МС




## Як «Звязда» развозіла пошту

СТАР. 4



## Калі звяртаюцца да сямейных псіхатэрапеўтаў

СТАР. 13

# Рамонкавае сэлфі



Маргарыта і Ян МЕСНІКІ з вёскі Заеліца Глускага раёна.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Спадчына

## ЗАМАК НА ПЕРАДАВОЙ

За сто гадоў пасля Першай сусветнай вайны Крэўскі замак амаль не змяніўся, але калі своечасова не прыняць меры, ён можа знікнуць назаўсёды

**Пабудаваны ў пачатку XIV (а па некаторых крыніцах, у канцы XIII) стагоддзя, ён быў сведкам ключавых падзей у гісторыі не толькі нашай краіны, а цэлай Еўропы. За сем стагоддзяў існавання Крэўскі замак не аднойчы станавіўся арэнай барацьбы за ўладу. Тут вырашаўся лёс дзяржаў, аб'ядноўваліся вядомыя каралеўскія дынастыі. Адно са старэйшых абарончых збудаванняў на тэрыторыі Беларусі бралі ў асаду мяцежныя князі, маскоўскія ваяводы, перакопскія татары...**

Але найбольш Крэўскі замак пацярпеў у гады Першай сусветнай вайны. Амаль два з паловай гады — з верасня 1915-га па люты 1918 года — праз яго праходзіла лінія фронту. Воіны Рускай імператарскай арміі старажытныя сцэны не шкадавалі: з'яўляючыся часткай нямецкай сістэмы абароны, Крэўскі замак не выстаяў пад магутным агнём артылерыі.

СТАР. 3



**Від з нямецкіх пазіцый на Траецкую царкву і Княжаскую вежу Крэўскага замка. Зіма 1915—1916 гадоў.**

■ Прыёмная кампанія — 2017

## Матэматыка ўмацоўвае свае пазіцыі

На некаторыя спецыяльнасці прахадныя балы выраслі на 50—80 пунктаў

**Беларускія ВНУ на гэтым тыдні завяршаюць залічэнне на бюджэтную форму навучання. У некаторых вышэйшых навучальных установах, дзе абітурыенты паступалі толькі па выніках ЦТ, ужо нават абвясцілі імёны будучых першакурснікаў. Але, напрыклад, у творчых ВНУ да 26 ліпеня яшчэ працягваюцца ўступныя выпрабаванні па профільных дысцыплінах.**

### У БДУ «РУЛІЦЬ «МІЖНАРОДНАЕ ПРАВА»

У Белдзяржуніверсітэце гэтымі днямі адбываецца адкрытае залічэнне на першы курс. Новыя рэкорды сёлета ўстанавілі абітурыенты, якія паступалі на факультэт міжнародных адносін (ФМА). Так, на спецыяльнасцях «міжнароднае права» і «міжнародныя адносіны» прахадны бал склаў 384, на спецыяльнасці «лінгвакраіназнаўства» — 381.

Не сталі нечаканасцю і вельмі высокія балы на спецыяльнасцях эканамічнага профілю: «сусветная эканоміка» — 371, «менеджмент» (кірунак — менеджмент у сферы міжнароднага турызму) — 366, «мытная справа» — 359, «менеджмент» (кірунак «міжнародны менеджмент, інавацыйны менеджмент») — 367, «эканамічная інфарматыка»— 364, «фінансы і крэдыт» — 356, «эканоміка»— 353, «эканамічная тэорыя» — 343.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей РАЎНЕЙКА, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці:**

*«Выязным прыёмам грамадзян у Адміністрацыі Прэзідэнта ўдзяляецца павышаная ўвага. Такая форма зносін запатрабавана насельніцтвам, але таксама неабходна і нам, прадстаўнікам улады: мы павінны чуць людзей. Усе пытанні, якія хвалююць грамадзян, знаходзяцца на асаблівым кантролі. У Гродзенскім рэгіёне больш за палову пытанняў, якія паступілі падчас нядаўніх падобных прыёмаў, ужо зняты».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9458 | ▲ |
| Еўра | 2,2665 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0325 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0753 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

Да 100-годдзя «Звязды» засталося 14 дзён

### На ўсе 100!!!

**«Звязда» запрашае вас, шаноўныя чытачы, вашых блізкіх і сяброў на спартыўнае свята, якое адбудзецца ў суботу, 29 ліпеня, на спартыўнай пляцоўцы сталічнага Ліцэя №1 (праспект Газеты «Звязда», 6А).**

**Пачатак у 11.00. УВАХОД ВОЛЬНЫ.**

**Падрабязнасці на нашым сайце www.zviazda.by**